# СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

СЛОВА ПАРТЫЙНАМУ САКРАТАРУ: ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ — ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ ● СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ ● ЗАКОНЧЫЎСЯ ЗОРНЫ ПАХОД ● ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА ● СУПРАЦОЎНІЦТВА ПРАЦЯГВАЕЦЦА ● УСПАМІНЫ: АД АРЛА ДА ПРАГІ ● НАШЫ ВЫДАТНІКІ ● ДЫПЛОМНІЦА ● УНІВЕРСІТЭТ СПАРТЫЎНЫ ● ВЫНІКІ ФЕСТЫВАЛЮ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 18 (1205) ● 18 мая 1978 г. Цана 2 кап.

ЗОРНЫЯ ПАХОДЫ

## ШЛЯХАМІ СЛАВЫ

Напярэдадні Дня Перамогі маляўнічая вёска Маркоўскае, што на Гомельшчыне, стала сведкай заключнага этапа зорнага паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, прысвечанага 60-годдзю БССР і КПБ, 60-годдзю ВЛКСМ. Звыш 70 удзельнікаў паходу (студэнты розных факультэтаў нашага універсітэта) на гэтым злёце рапартавалі аб паспяховым заканчэнні намечаных маршрутаў.

1249 км — шлях, які прайшлі юнакі і дзяўчаты дзевяці груп па Мінскай, Брэсцкай, Гомельскай абласцях Беларусі і па Ровенскай вобласці Украінскай ССР.

— На працягу ўсяго маршрута, — гаворыць галоўны кіраўнік зорнага паходу старшыня турклуба універсітэта Анатоль Новікаў, — намі праведзена вялікая грамадска-палітычная работа, прачытана 68 лекцый. Змястоўныя і цікавыя лекцыі, падрыхтаваныя студэнтамі аб гісторыі універсітэта, выхаванні моладзі ў духу патрабаванняў XXV з'езда КПСС, вызваленчым руху ў капіталістычных краінах, расказы пра XVIII з'езд камсамола ніколі не пакідалі слухачоў абыякавымі.

За час паходу ўдзельнікі не толькі пазнаёміліся са слаўнымі мясцінамі, але і актыўна дапамагалі моладзі ў арганізацыі і правядзенні сустрэч з былымі франтавікамі, гвардзейцамі працоўнай славы, вялі запісы іх расказаў. За час паходу адбылося 26 такіх сустрэч. Студэнты былі частымі гасцямі ў школах, дапамагалі вучням афармляць стэнды. Кожны канцэрт, арганізаваны імі, сустракаўся з вялікай цеплынёй.

У канцы паходу кожнаму удзельніку быў уручан значок «Мінскі клуб турыстаў». Цікава прайшло спартыўнае свята, у якім прыняла ўдзел і вясковая моладзь.

М. КУРГАНСКІ.

## ЗАПРАШАЕ БІБЛІЯТЭКА

Усіх, каго цікавяць толькі што выйшаўшыя ў свет новыя кнігі, запрашае спецыяльны інфармацыйны сектар новай кнігі, які створан пры бібліятэцы БДУ.

Сюды прыходзяць усе навінкі літаратуры, затым пасля нядзельнай дэманстрацыі перадаюцца ў кнігасховішча.

Чытач можа заказаць любую кнігу, якая затым будзе перададзена ў аддзел абслугоўвання.

Акрамя таго, арганізуюцца тэматычныя прагляды кніг, што дае магчымасць глыбей раскрыць фонд бібліятэкі. Тэмы такіх выставак падбіраюцца ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі і праграмамі па заяўках кафедр і грамадскіх арганізацый універсітэта.

А. ЯКУБОЎСКАЯ.





У партыйных арганізацыях універсітэта пачаліся справаздачна-выбарныя сходы. Яны ўжо адбыліся на факультэце журналістыкі і юрфаку.

Камуністы журфака на сходзе павялі дзелавую, крытычную размову аб факультэцкіх справах, намецілі планы будучай работы. Са справаздачным дакладам выступіў сакратар партбюро факультэта С. В. Говін.

**На здымках:** уважліва слухаюць камуністы выступаючых; выступае дэкан факультэта журналістыкі Р. В. Булацкі.

Фота **У. Прачуханава.**

Слова партыйнаму сакратару

## ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ—ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ

У сваім артыкуле «На пярэднім краі» намеснік сакратара парткома БДУ У. А. Навумовіч пісаў: «Поспех агульнай справы залежыць ад таго, наколькі кожны пранікся разуменнем важнасці таго, над чым працуе ўвесь калектыў. Аснова поспеху закладваецца ў пярвічных калектывах, у якіх вялікая роля належыць партгрупам. Нездарма гавораць, што партгрупа — «гарачы цэх», «ліцейка», дзе фарміруюцца характары людзей і іх адносіны да справы».

І з гэтым нельга не згадзіцца. Таму партыйнае бюро філалагічнага факультэта вялікую ўвагу аддае іменна рабоце ў партгрупах. А іх на факультэце дзевяць.

**Два разы ў месяц партыйнае бюро праводзіць семінары партгрупоргаў, на якіх абмяркоўваюцца актуальныя пытанні, звязаныя з работай партгруп: тэматыка сходаў у партгрупах, пастановы вышэйстаячых партыйных органаў, формы і метады работы партгрупорга ў ВНУ і г. д.**

**Партгрупоргі перыядычна абменьваюцца вопытам работы. Так, запомніўся семінар, на якім партгрупорг кафедры беларускай літаратуры М. Б. Яфімава расказала аб формах і метадах работы партгрупы ў школе (цесная дзелавая дружба звязвае гэту партгрупу са школамі № 1, 44, 122 г. Мінска).**

Выкладчыкі кафедры выязджалі ў школы Мядзельскага раёна, выступалі перад настаўнікамі і вучнямі старэйшых класаў з дакладамі па праблемах сучаснай паэзіі і прозы.

Зацікавіў вопыт партгрупы кафедры рускай мовы па рабоце ў інтэрнаце. Партгрупа (партгрупорг Т. А. Ляонава) правяла вечар рускай мовы ў інтэрнаце № 4. У ім прынялі ўдзел усе выкладчыкі кафедры, вечар прайшоў вельмі жыва, выклікаў вялікую зацікаўленасць студэнтаў.

Неаднаразова сустракаўся з партгрупамі намеснік сакратара парткома У. А. Навумовіч, які даваў цікавыя, патрэбныя парады партгрупоргам.

Партыйнае бюро выкарыстоўвае і сродкі нагляднай агітацыі для практычнай дапамогі партгрупоргам.

У партбюро афармлен стэнд «Экспрэс-інфармацыя» (у дапамогу партгрупоргу). Тут ёсць наступныя раздзелы: «З пастаноў партыйнага бюро», «Прыкладная тэматыка партыйных сходаў», «Савет куратараў прапаноўвае», «Маральна-эстэтычная камісія інфарміруе», «Заданні партыйным групам». Тут жа змяшчаюцца ўсе актуальныя матэрыялы, якія датычацца жыцця і дзейнасці партгруп.

**План работы партыйнага бюро філфака размножан на ратапрынце, кожны партгрупорг мае яго.**

**Дзелавая размова аб жыцці партгрупы пастаянна вядзецца на партыйных сходах факультэта. У сакавіку 1977 года адбыўся партыйны сход, на якім абмяркоўвалася пытанне «Аб метадах паляпшэння вучэбна-выхаваўчай работы на кафедры рускай мовы». Змястоўны даклад зрабіла партгрупорг кафедры Т. А. Ляонава, у якім яна расказала аб найбольш цікавых формах і метадах работы партгрупы.**

Так, партгрупа вялікую ўвагу удзяляе рабоце куратараў.

Перыядычна на сумесных пасяджэннях партгрупы і кафедры заслухоўваюцца справаздачы куратараў аб рабоце ў акадэмічных групах. Па ініцыятыве партгрупы праводзяцца кафедральныя семінары куратараў, на якіх яны шырока абменьваюцца вопытам работы.

Пытанні, звязаныя з вучобай камсамольскага актыву, індывідуальнай работай са студэнтамі, роляй куратара ў жыцці акадэмічнай групы, правядзеннем палітінфармацый, пастаянна ў цэнтры ўвагі партгрупы.

Дзякуючы актыўнасці партгрупы кафедры рускай мовы, яе ўдзелу ў вырашэнні ўсіх пытанняў, знойдзены добрыя формы работы і з беспартыйнымі выкладчыкамі, на кафедры пануе дзелавая, працоўная абстаноўка.

**Партыйнае бюро факультэта у сваім пастаянным кіраўніцтве партгрупамі імкнецца да таго, каб партгрупы сталі цэнтрам выхаваўчай работы, актыўна ўключаліся у жыццё кафедры.**

**Заслугоўвае ўвагі вопыт работы партгруп сумесна з кафедрамі ў сярэдніх агульнаадукацыйных школах.**

**У лютым 1978 года адбыўся партыйны сход з парадкам дня: «Аб пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб агульнаадукацыйнай школе і падрыхтоўцы вучняў да працы» і задачы партыйнай арганізацыі факультэта».**

**У падрыхтоўцы гэтага партыйнага сходу прынялі актыўны ўдзел партгрупы. Кожная з іх прадставіла падрабязную справаздачу аб рабоце ў сярэдняй школе. Камісіяй, створанай пры партбюро, быў падрабязна вывучан вопыт кожнай партгрупы.**

Заслугоўвае ўвагі вопыт работы партгрупы кафедры беларускай літаратуры (партгрупорг М. Б. Яфімава). Сумесна з кафедрай (загадчык кафедры В. В. Казлова) партгрупа праводзіць вялікую работу ў школах Салігорска, Барысава, Мінска.

У 122-й школе Мінска адкрыт музей В. І. Казлова, сабраны багатыя матэрыялы па Мінскаму злучэнню. Часты госць у школе загадчык кафедры беларускай літаратуры В. В. Казлова.

**Партгрупай сумесна з кафедрай быў наладжан выезд выкладчыкаў у школы Мядзельскага раёна. Паэты і літаратуразнаўцы А. А. Лойка, Д. Я. Бугаёў, С. Х. Александровіч прынялі ўдзел у гэтай паездцы, выступілі перад вучнямі.**

**Ва ўсіх партыйных групах адбыліся справаздачна-выбарныя партыйныя сходы, на якіх былі падведзены вынікі работы за год, намечаны планы на будучае.**

Сёння можна сказаць, што партыйныя групы філалагічнага факультэта значна ажывілі сваю работу. Але наперадзе яшчэ шмат важных спраў, выкананне якіх патрабуе ад нас вялікага напружання.

**І. КЛЮЧАНОВІЧ,**
**сакратар партбюро філфака.**

**Вось ужо некалькі год запар супрацоўнічаюць Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна і Іенскі універсітэт імя Ф. Шылера. Акрамя абмену вопытам работы, праводзіцца і абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі. Гэта ўжо стала добрай традыцыяй. У гэтым годзе, як і ў мінулыя, са зводным будаўнічым атрадам Іенскага універсітэта, прадстаўнікі якога прыбылі ў наш універсітэт, быў заключан чарговы дагавор.**

**Амаль праз два месяцы інтэратрад «Таварыш-78», камандзір якога У. Карагін, камісар В. Мацэль, прыме 15 байцоў з ГДР. К іх прыезду ў атрадзе вядзецца вялікая падрыхтоўчая работа. А зараз ад імя атрада з прадстаўнікамі Іенскага універсітэта былі адпраўлены азнаямленчае пісьмо, невялікія сувеніры.**

**Пасля пасяджэння камітэта камсамола, на якім прысутнічалі і камандзіры інтэратрадаў, госці сустрэліся з байцамі атрадаў, расказалі аб сваім універсітэце, жыцці студэнтаў, была арганізавана экскурсія па гораду.**

**У. БЕЛЬСКІ.**



**НА ЗДЫМКУ:** у час заключэння дагавору.



Генадзь Ціхановіч працуе над дыпломнай работай у лабараторыі лічбавай тэхнікі кафедры электронных матэматычных машын.

Фота М. Дубовіка.

# ВЫВУЧАЕМ ЛЕНІНА

Забеспячэнне глыбокага і ўсебаковага вывучэння вялізнай тэарэтычнай спадчыны У. І. Леніна — адна з важнейшых задач грамадскіх кафедр. Вялікую ўвагу гэтаму пытанню ўдзяляе і кафедра палітэканоміі гуманітарных факультэтаў. Яна пастаянна ўдасканальвае формы і метады работы па авалоданню студэнтамі ленінскай тэарэтычнай спадчынай. Аб гэтым сведчыць спецыяльнае пасяджэнне кафедры з удзелам студэнтаў аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта, прысвечанае 60-годдзю з дня выхаду ў свет работы У. І. Леніна «Чарговыя задачы Савецкай улады».

З асноўным дакладам «Работа У. І. Леніна над «Чарговымі задачамі Савецкай улады», іх змест і актуальнасць» выступіў старэйшы член кафедры, актыўны ўдзельнік будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне кандыдат эканамічных навук, дацэнт І. К. Караленка.

Цікавым і змястоўным было выступленне студэнта IV курса аддзялення палітэканоміі В. Люковіча. Ён расказаў аб ажыццяўленні ленінскіх ідэй аб сацыялістычным спаборніцтве, яго паступовым перарастанні ў рух за камуністычную працу.

З вялікай увагай было выслухана паведамленне аспіранткі Т. Ф. Цэхановіч на тэму «У. І. Ленін аб значэнні росту прадукцыйнасці для перамогі сацыялізму і камунізму ў сусветным маштабе».

Значную цікавасць ўяўляла таксама выступленне студэнткі IV курса гістарычнага факультэта (аддзяленне палітэканоміі) Л. Лютко на тэму «Ленінскія прынцыпы кіравання вытворчасцю».

Сумесная работа членаў кафедры і студэнтаў па асэнсаванню тэарэтычнай спадчыны У. І. Леніна — важная форма ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу, глыбокага авалодання марксізмам-ленінізмам.

**П. БОРСУК,**
**дацэнт, в. а. загадчыка кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў.**

Ленінскія стыпендыяты

# НАСТОЙЛІВАСЦЬ

Я ўбачыла яе фотаздымак на Дошцы гонару. Задумлівы, прамы позірк, ледзь бачная ўсмешка на вуснах. А потым быў інтэрнат нумар 1, дзе яна жыве.

— Мне б убачыць...

— А-а-а, Людмілу Валюк, —перапытала мяне дзяжурная. — Праходзьце на трэці паверх.

Сядзелі ў невялікім студэнцкім пакоі, размаўлялі. Люда тым часам карміла сямімесячнага Сяргейку. Не вытрымала я, запыталася: «Вельмі цяжка даводзіцца?»

— Не, сын у мяне ўжо вялікі, разумее, што маці трэба рыхтавацца да здачы дзяржаўных экзаменаў, — паўжартам адказвае Люда і дадае:—Наш тата нам дапамагае.

Пяты курс. Людміле зараз самой не верыцца, што гэта апошні год яе студэнцкага жыцця. Такія шчаслівыя, непаўторныя гады! А галоўнае —для Люды яны не прайшлі дарэмна. Вучоба і актыўны ўдзел у грамадскай рабоце ў яе разуменні непадзельныя.

Настойлівасць характару, вера ў свае сілы і шчырасць гэтай дзяўчыны адразу заваявалі сімпатыі аднакурснікаў. Яе абралі камсоргам групы на першым курсе. А потым—членам камітэта камсамола, намеснікам сакратара камсамольскай арганізацыі факультэта.

І як толькі гэтая дзяўчына ўсюды паспявала? Вучыцца толькі на выдатна і займаецца грамадскай работай.

— Усюды паспяваць я яшчэ ў школьныя гады навучылася, — гаворыць Люда. —Дакладнае размеркаванне свайго часу — вось галоўны сакрэт поспеху.

Вечарамі Люда любіла працаваць у бібліятэцы. Яшчэ не было такога выпадку, каб яна не падрыхтавалася да семінарскіх заняткаў, не напісала ў тэрмін даклад або рэферат. Яе стараннасць, працавітасць высока ацэнены. Люда Валюк — ленінскі стыпендыят.

Стаць гісторыкам... Да гэтай мары Люда прыйшла не адразу. У школе ёй лёгка даваліся ўсе прадметы. Перавагу аддавала хутчэй прыродазнаўчым, чым гуманітарным дысцыплінам. Але ў старэйшых класах пацягнула да гісторыі. Магла бясконца чытаць дадатковую літаратуру па гэтаму прадмету.

Хутка бяжыць час. Праз некалькі месяцаў Люда будзе працаваць асістэнтам на кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. А зараз на стале ляжаць разгорнутыя кнігі, канспекты. Люда рыхтуецца да дзяржаўных экзаменаў. Няма сумнення, што яны пройдуць не менш паспяхова, чым экзамены за пяць гадоў вучобы ва універсітэце.

**А. БАШУН,**
**студэнтка II курса журфака.**



Карлен Мкртчан прыехаў у Мінск з Тбілісі. Усяго некалькі месяцаў назад ён стаў студэнтам першага курса юрыдычнага факультэта, але ўжо зараз яго ведаюць тут усе. Ведаюць як здольнага, актыўнага студэнта. Ён займаецца толькі на «выдатна» і «добра».

Малады камуніст знаходзіць час для грамадскай работы. Ён — намеснік камандзіра аператрада універсітэцкага інтэрната № 2, кіраўнік вакальна-інструментальнага ансамбля юрфака.

Фота В. Лапіна.

Успаміны

# Ад Арла да Прагі

(Заканчэнне. Пачатак у № 16).

Узбагачаныя вопытам прарыву абароны праціўніка на Арлоўскім напрамку, камандзіры і штабы нашых брыгад сумелі ў кароткі тэрмін арганізаваць разведку, спланаваць і падрыхтаваць агонь, устанавіць узаемадзеянне з агульнавайсковымі злучэннямі.

У ходзе наступлення ў штаб дывізіі паступалі даныя паветранай разведкі, якія дазвалялі вызначыць раёны сканцэнтравання буйных рэзерваў праціўніка і верагодныя напрамкі іх дзеянняў. Падтрымліваемыя нашым агнём, пяхота і танкі паспяхова наступалі ў напрамку Харкава. Было ўстаноўлена, што вялікія калоны танкаў праціўніка накіраваліся ў лясы, якія раскінуліся побач з пасёлкам Тамароўка. Дадатковая разведка ўстанавіла больш дакладны раён сканцэнтравання войск праціўніка і раскрыла яго задуму нанесці контрудар у фланг нашых танкавых і пяхотных часцей.

Імкліва наступаючы затым у саставе войск Першага Украінскага фронту, наша дывізія выйшла да Дняпра заходней Пераяслаўля-Хмяльніцкага. Артылерысты своечасова занялі баявыя пазіцыі, правялі разведку боем і знішчылі агнявыя кропкі праціўніка. Нашы войскі фарсіравалі раку з ходу, а затым утрымалі і расшырылі плацдарм у раёне вёсак Грыгораўка, Лукавіцы, Вялікі і Малы Букрын.

Успамінаю такі баявы эпізод. Камандзір 88-й цяжкай гаўбічнай брыгады палкоўнік В. Кафанаў заняў назіральны пункт у раёне Грыгораўкі, на заходнім беразе Дняпра. Яго падраздзяленні вялі агонь і забяспечвалі далейшае наступленне пяхоты і танкаў, адбівалі неаднаразовыя контратакі. Але вось праціўнік сілай да батальёна з дзесяццю танкамі прадпрыняў чарговую контратаку. Усе разведчыкі, сувязісты разам з пяхотай занялі рубеж абароны. Камандзіры нашых дывізіёнаў і батарэй адкрылі загараджальны агонь. Контратака была адбіта. Гітлераўцы, пакінуўшы на полі бою чатыры падбітыя танкі, спешна адступілі. У гэтым баі загінуў смерцю героя камандзір дывізіёна Г. Іваноў, якому пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. За смеласць і адвагу пры фарсіраванні Дняпра званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена таксама нашаму баявому сябру — камандзіру 4-га дывізіёна, капітану Я. Кісялёву.

Пасля авалодання плацдармам заходней Пераяслаўля-Хмяльніцкага дывізіі давялося ў вельмі сціслыя тэрміны перадыслацыравацца ў іншы раён фронту і падрыхтавацца да наступлення ў саставе войск 38-й арміі, прыняць удзел у баях за вызваленне сталіцы Украіны — Кіева. Даведаўшыся аб гэтым, байцы і афіцэры з асаблівай энергіяй рыхтаваліся да прадстаячых баёў. У ходзе незабываемай бітвы яны праявілі масавы гераізм. Агнём нашых часцей і падраздзяленняў расчышчаўся шлях пяхоце і танкам. Больш таго, многія разведчыкі і сувязісты дывізіі разам з камандзірамі батарэй і дывізіёнаў уварваліся ў горад у ліку першых. За выдатныя баявыя дзеянні дывізія была ўзнагароджана ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга і ўдастоілася звання Кіеўскай.

У студзені 1944 года нашы часці выйшлі на рубеж Зазава-Ліпавец і разгарнулі наступленне ў напрамку Вінніцы. К гэтаму часу наступіла адліга, цяжкім стаў рух па дарогах, мала было боепрыпасаў. Аднак усе агнявыя кропкі, якія перашкаджалі наступленню пяхоты, мы стараліся своечасова знішчыць. 10 студзеня 1944 года 162-ю стралковую дывізію, якую падтрымлівала наша 47-я гаубічная брыгада, контратакавалі буйныя сілы танкаў праціўніка. Каля 100 варожых машын выйшлі на пазіцыі нашых батарэй. Артылерысты не здрыгануліся. Яны адкрылі агонь з адкрытых пазіцый і прамой наводкай расстрэльвалі фашысцкія танкі. А калі не стала снарадаў (іх было па пяць-шэсць на гармату), нашы воіны знішчалі варожыя машыны звязкамі ручных гранат.

Летам 1944 года пры падрыхтоўцы Львоўскай аперацыі 13-я артылерыйская дывізія прыбыла ў падначаленне 3-й гвардзейскай арміі Першага Украінскага фронту. І тут нам давялося прарываць абарону праціўніка, завяршаючы вызваленне тэрыторыі Украіны. Потым мы накіраваліся да Віслы.

У студзені 1945 года, калі здзяйснялася Вісла-Одэрская аперацыя, наша дывізія падтрымлівала наступленне войск 13-й арміі. Падрыхтоўка і планаванне гэтай аперацыі праходзілі ў вельмі складаных і цяжкіх умовах. Часці дывізіі стаялі на пазіцыях і забяспечвалі абарону ў адным раёне, а органы кіравання і разведка зусім у іншым месцы рыхтавалі прарыў абароны праціўніка. Да пачатку наступлення з-за дрэнных метэаралагічных умоў авіяцыя не магла выконваць свае задачы. Таму нам прыйшлося частку іх узяць на сябе. І ўсё ж удалося забяспечыць прарыў першай і другой палос абароны гітлераўцаў. Дзякуючы гэтаму наступленне нашых часцей праходзіла паспяхова. Раку Одэр савецкія войскі фарсіравалі з ходу.

Пасля авалодання горадам Нэйсе 13-я дывізія ўвайшла ў састаў 4-га Украінскага фронту. Тут яна ўдзельнічала ў прарыве абароны праціўніка заходней Мараўскай Астравы, дзе гітлераўцы занялі раней пакінутыя доты, перарабілі іх і аказвалі вельмі ўпартае супраціўленне. Нам прыйшлося выбіваць іх з гэтых умацаванняў прамой наводкай некалькіх 203-міліметровых гармат. Пасля прарыву абароны часці дывізіі разам з пяхотай і танкамі накіраваліся да сталіцы Чэхаславакіі Прагі, дзе і закончылі свае баявыя дзеянні.

Радушна сустракалі савецкіх воінаў-вызваліцеляў чэхаславацкія сябры. Артылерыйскія прыстасаванні, танкі і іншае ўзбраенне яны літаральна засыпалі першымі вясновымі кветкамі. Са слязамі радасці чэхі і славакі выказвалі гарачую ўдзячнасць воінам Савецкай Арміі, якія прынеслі народам Чэхаславакіі, як і іншым народам Еўропы, свабоду і незалежнасць.

Баявыя дзеянні асабістага саставу нашай дывізіі высока ацэнены партыяй і ўрадам. 13-я артылерыйская дывізія прарыву ў гады вайны была ўзнагароджана ордэнамі Баявога Чырвонага Сцяга, Суворава II ступені, Кутузава II ступені і ўдастоена ганаровага звання Кіеўскай.

**А. МІЗРАХІ,**
**палкоўнік запасу.**

# СВЯТА ЎСМЕШАК НА ХІМФАКУ

...З-за куліс, спачатку ціха, а пасля ўсё смялей і больш упэўнена, чуецца песня «Родныя сэрцу паверхі». Пачынаецца чарговы дзень хіміка.

У 1973 годзе студэнтамі хімічнага факультэта быў падрыхтаван і праведзен першы дзень хіміка. З таго часу свята факультэта праводзіцца штогод вясной у красавіку і, як лічаць самі хімікі, робіцца ўсё больш вясёлым і цікавым.

...На сцэне двое вядучых. Яны коратка знаёмяць гледачоў з гісторыяй узнікнення дзён іх факультэта. Пачынаецца ўрачыстая частка свята — падпісанне дагавору паміж студэнтамі першага курса і дэканатам аб дружбе і супрацоўніцтве тэрмінам на пяць год. Дэкан хімічнага факультэта Г. А. Браніцкі віншуе ў прывітальнай прамове першакурснікаў з прыняццем іх у калектыў студэнтаў і жадае ім вялікіх поспехаў на шляху да ведаў.

На сцэну выходзяць госці хімікаў — студэнты з Краснадара, Ташкента, Адэсы, Масквы, Вільнюса, Новасібірска, Свярдлоўска. Гаспадары і госці абменьваюцца віншаваннямі.

А потым выступае МХАТ — так хімікі называюць свой мясцовы хіміка-аналітычны тэатр. Да дзён хіміка артысты падрыхтавалі новыя спектаклі «Калідор» і «На розных узроўнях». Акрамя таго, была паўторана пастаноўка «Блакітны трамвай», якая вельмі падабаецца і выкладчыкам і студэнтам.

Удзельнікі свята атрымалі вялікі зарад добрага настрою.

**У. ДЗЯКАЎ.**

# ФЕСТЫВАЛЬ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Нястомным клопатам партыі аб росце народных талентаў прасякнута прынятая нядаўна пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю самадзейнай народнай мастацкай творчасці». У ёй адзначаецца, што здзейсненыя за гады Савецкай улады сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў краіне, рост матэрыяльнага дабрабыту, павышэнне ўзроўню адукацыі і культуры народа, наяўнасць вольнага часу ствараюць спрыяльныя ўмовы для ўсебаковага развіцця асобы, росквіту талентаў. У гэтым важным дакуменце намечаны шляхі ўдасканалення работы па эстэтычнаму выхаванню працоўных.

Цяжка пераацаніць ролю народнай мастацкай творчасці ў камуністычным выхаванні моладзі. Нядаўна прайшоўшы агляд факультэцкай самадзейнасці нашага універсітэта паказаў, што сотні студэнтаў далучаюцца да мастацтва і самі выступаюць стваральнікамі духоўных каштоўнасцей.

Мэтай агляду было далейшае развіццё мастацкай самадзейнасці на факультэтах, прапаганда сродкамі мастацтва савецкага-гістарычнага значэння Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, гераічнай гісторыі Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый нашага народа. Трэба адзначыць, што ў асноўным з гэтай задачай факультэты справіліся. Народная мастацкая творчасць паспяхова развіваецца там, дзе партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі і дэканаты ўдзяляюць ёй пастаянную ўвагу, справядліва лічачы важным сродкам уздыму культуры студэнтаў.



У нашым фестывалі прынялі ўдзел усе факультэты універсітэта. Былі паказаны змястоўныя і разнастайныя канцэртныя праграмы, лепшымі з якіх трэба прызнаць праграмы наступных факультэтаў: журналістыкі, філалагічнага, біялагічнага, гістарычнага і радыёфізікі і электронікі. Прыкладам мэтанакіраванай, дзейснай прапаганды самадзейнага мастацтва, умелага прыцягнення да яго шырокага грамадскага інтарэсу можа служыць дзейнасць гэтых калектываў.

Сваю творчасць, сваё майстэрства нашы студэнты прысвяцілі 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі і XI Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване.

У гэтым годзе адбыўся прыкметны якасны скачок самадзейнай мастацкай творчасці. Асабліва ў гэтым плане хочацца адзначыць тры факультэты: юрыдычны, біялагічны і факультэт радыёфізікі і электронікі. У цяперашні агляд іх праграмы адрозніваліся глыбінёй зместу, разнастайнасцю форм, выканаўчым майстэрствам. Аднак ёсць факультэты (ФПМ, фізічны), якія вынеслі на суд гледачоў і журы слабыя канцэртныя праграмы. Відаць, ніхто сур'ёзна не займаўся складаннем рэпертуару.

Пры падвядзенні канчатковых вынікаў агляду месцы размеркаваліся наступным чынам:

I — факультэт журналістыкі
II — радыёфізікі і электронікі
III — гістарычны
IV — біялагічны
V — філалагічны
VI — геаграфічны
VII — юрыдычны
VIII — хімічны
IX — механіка-матэматычны
X — фізічны
XI — ФПМ.

Вызначыліся прызёры па асобных жанрах.

Лепшымі сярод харавых калектываў журы прызнала хор факультэтаў: журналістыкі, радыёфізікі і электронікі, юрыдычнага.

Асабліва прыемна было адзначыць добрыя выступленні аркестраў народных інструментаў механіка-матэматычнага (кір. Ігар Васільеў) і гістарычнага факультэтаў (кір. Мікалай Застаўнюк). Сярод вакальных ансамбляў адзначаны калектывы гістарычнага факультэта, журналістыкі, радыёфізікі і электронікі. Амаль усе факультэты паказалі свае вакальна-інструментальныя ансамблі. Але гэты распаўсюджаны жанр у якасных адносінах яшчэ пакідае жадаць лепшага. Першае месца прысуджана калектыву філалагічнага факультэта, другое — радыёфізікі і электронікі і трэцяе — юрыдычнага. Цудоўныя танцавальныя калектывы ў гэтым годзе на агляд прадставілі гісторыкі, географы і біёлагі.

Вызначыліся пераможцы і сярод асобных выканаўцаў:

чытанне — Э. Драбышэўская (журфак)

танцоры — Л. Кавальчук (хімфак)

вакалісты — Я. Булыга (філфак)

інструменталісты — С. Барысевіч (геафак).

Добра выступілі студэнцкія тэатры-мініяцюры (біёлагі, хімікі, журналісты).

Такім чынам агляд закончан, вынікі падведзены. Аднак трэба надаваць важнае значэнне далейшаму развіццю народнай мастацкай творчасці. Пакуль яшчэ прымушае жадаць лепшага рэпертуар тэатраў-мініяцюр, агітбрыгад, належыць удасканальваць выканаўчае майстэрства хораў. У праграмы неабходна шырэй уключаць папулярныя творы аб нашай партыі, сацыялістычнай Радзіме, аб гераічнай працы народа, фальклор і сучасную народную творчасць. Усямерна клапаціцца аб жанравай разнастайнасці, стварыць на факультэтах спадарожнікі лепшых агульнауніверсітэцкіх калектываў мастацкай самадзейнасці. Актыўней прыцягваць да работы дзеячоў мастацтва, літаратуры, культуры і спорту. Ад самадзейных калектываў мы чакаем удалых задум і творчых увасабленняў, невычарпальнага студэнцкага гумару і вялікіх поспехаў. Няхай мацней б'юць крыніцы народных талентаў.

**Н. КУЗНЯЦОВА,**
мастацкі кіраўнік клуба.

# СПОРТ

## У ПРАГРАМЕ КРУГЛАГАДАВОЙ

У рамках круглагадавой спартакіяды скончылася першынство універсітэта па цяжкай атлетыцы. У ім прынялі ўдзел дзевяць факультэцкіх каманд.

У спаборніцтвах не прымалі ўдзелу мацнейшыя атлеты БДУ, таму напружаная барацьба разгарнулася паміж маладымі спартсменамі за права ўвайсці ў састаў зборнай універсітэта.

У выніку наперад выйшлі: студэнт ФПМ, майстар спорту А. Кавалеўскі, які палепшыў свой рэкорд на 7,5 кг у суме двухбор'я, малады здольны спартсмен з хімфака А. Сырoўскі, студэнт IV курса фізфака В. Лукша і іншыя студэнты. Яны парадавалі сваіх трэнераў нядрэннымі вынікамі.

У камандным спаборніцтве асноўныя сапернікамі былі тры факультэты: юрыдычны, фізічны і ФПМ. Перамагла каманда юрфака, на другім месцы фізфак і на трэцім ФПМ.

Зараз вядучыя атлеты рыхтуюцца да спартакіяды горада і рэспублікі.

**А. ДЫНІКАЎ.**

## ЭСТАФЕТА ПОСПЕХУ

Вуліца К. Маркса. У дзяжурным аўтобусе хтосьці паведаміў: «Пасля першага этапа эстафету ўзначаліла каманда ІФК». Гэта нікога не здзівіла. Хвалявала іншае. Хто ўвайшоў у тройку мацнейшых? З якім разрывам бягуць?

...Апошні пад'ём. Здалёк бачу Уладзіміра Квача. Зусім нядаўна ён стаў пераможцам агульнауніверсітэцкага кросу. Зараз яму даверылі самы адказны і таму вельмі цяжкі этап.

— Трэцім! — паспеў крыкнуць Валодзя, падняўшы вялікі палец угару. Па яго стомленым твары блукала шчаслівая ўсмешка. Добры пачатак!

Аўтобус імчыцца далей, туды, дзе кожная хвіліна напоўнена напружанай спартыўнай барацьбой.

Праспект імя У. І. Леніна. Павялічваем хуткасць. Трэба быць у цэнтры ўсіх падзей. Мільгае этап за этапам. Другі, трэці... Лідзіруючая група бяжыць па-ранейшаму. Не, нешта здарылася, бо трэцім ужо бяжыць нехта незнаёмы ў чырвонай майцы. Пэўна, нейкі зрыў. Спорт ёсць спорт. А наперадзе рашаючы этап працягласцю амаль два кіламетры.

...Эстафету прымае Міхаіл Пыж. Ён вяртае універсітэту другое месца. Але ёсць яшчэ сілы, ёсць жаданне перамагчы. Апошняе намаганне, і каманда БПІ застаецца на некалькі дзесяткаў метраў ззаду. Паварот. Першая палова ўсёй эстафетнай трасы пройдзена. Поспех замацоўвае член зборнай Беларусі па лёгкай атлетыцы студэнтка хімфака Ірына Чурсіна.

На спідометры — каля сарака кіламетраў у гадзіну. Толькі так можна паспець за спартсменамі. Уся эстафета расцягнулася па вуліцы няроўным ланцужком. Зараз толькі нейкі выпадак, здарэнне можа змяніць што-небудзь у расстаноўцы сіл.

— Добрая ў нас каманда. Ёсць усе падставы разлічваць на поспех, — прыгадваю я словы В. В. Зарэцкай, трэнера зборнай універсітэта па лёгкай атлетыцы.

...Фініш. Вытрымалі! Як эстафету перадалі мінулагодні поспех. Зноў другое месца! Але нездарма першае пытанне, з якім звярнуўся да мяне Валерый Грыбкоўскі, удзельнік эстафеты, было: «Колькі прайгралі пераможцам?» Значыць можна прабегчы лепш, значыць можна стаць і першымі!

**С. ЛЫСКАВЕЦ.**



**НА ЗДЫМКАХ:** дыплом другой ступені прымае каманда універсітэта.

Фота аўтара.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС
220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 03252 Тыраж 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ. № 783.